Паважаныя члены журы!
У дадзеным туры прадугледжана выкананне 60 заданняў, пры правільным выкананні якіх удзельнікі алімпіяды могуць набраць 130 балаў. Правільныя адказы пазначаны тлустым шрыфтам.

Паважаныя члены журы!
У заданнях 1–20 неабходна было выбраць адзін правільны адказ. Правільныя адказы пазначаны тлустым шрыфтам.
**За правільны адказ – 1 бал.**

1. Вялікі князь Віцень у 1307 г. далучыў да ВКЛ землі:
А) Мсціслаўскага княства
**Б) Полацкага княства**
В) Менскага княства
Г) Віцебскага княства

На аснове матэрыялаў: Цемушаў, С.М. Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XV ст. : вучэб. дапаможнік для 6-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання і выхавання / С.М. Цемушаў, Ю.М. Бохан ; пад рэд. І.А. Марзалюка. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2023 (§ 18, стар. 127).

2. Калі адбыўся царкоўны раскол, які падзяліў хрысціянства на каталіцтва і праваслаўе?
А) 1064 г.
Б) 1037 г.
**В) 1054 г.**
Г) 1047 г.

На аснове матэрыялаў: Гісторыя Сярэдніх вякоў : вучэб. дапаможнік для 6-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання і выхавання / А.А. Прохараў [і інш] ; пад рэд. А.А. Прохарава. – Мінск : Народная асвета, 2023 (§ 9, стар. 57).

3. Царкоўны сабор, на якім рымскі папа Урбан II заклікаў да крыжовых паходаў, праведзены ў:
**А) 1095 г.**
Б) 1090 г.
В) 1093 г.
Г) 1096 г.

На аснове матэрыялаў: Гісторыя Сярэдніх вякоў : вучэб. дапаможнік для 6-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання і выхавання / А.А. Прохараў [і інш] ; пад рэд. А.А. Прохарава. – Мінск : Народная асвета, 2023 (§ 9, стар. 59).

4. У Афінах філасофскую школу – Акадэмію – заснаваў:

А) Арыстоцель

**Б) Платон**

В) Сакрат

Г) Фукідыд

На аснове матэрыялаў: Гісторыя Старажытнага свету (у 2 частках, частка 2): вучэб. дапаможнік для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / У.С. Кошалеў, А.А. Прохараў, А.В. Перзашкевіч, В.Г. Жураўлевіч; пад рэд. У.С. Кошалева. – Мінск : Народная асвета, 2019 (§ 12, стар. 51).

5. Ураджэнец Гродзеншчыны, генерал расійскай арміі, адзін з самых таленавітых военачальнікаў Першай сусветнай вайны, узнагароджаны ордэнам Святога Георгія 3-й ступені:

**А) П.А. Лячыцкі**

Б) П.І. Казятнікаў

В) М.А. Бржазоўскі

Г) Ул.З. Май-Маеўскі

На аснове матэрыялаў: Паноў, С.В. Гісторыя Беларусі, канец XVIII – пачатак XX ст. : вучэб. дапаможнік для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / С.В. Паноў, С.В. Марозава, У.А. Сосна; пад рэд. У.А. Сосны. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2018 (§ 27, стар. 127).

6. Укажыце дату, калі ў Беластоку пачаў работу Народны сход Заходняй Беларусі:

А) 28 верасня 1939 г.

**Б) 28 кастрычніка 1939 г.**

В) 2 кастрычніка 1939 г.

Г) 2 лістапада 1939 г.

На аснове матэрыялаў: Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны) : дапаможнік для ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А.А. Каваленя [і інш] ; пад рэд. А.А. Кавалені. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2020 (§ 2, стар. 27).

7. Хто камандаваў войскамі ЗахАВА (Заходняй Асобай ваеннай акругі)?

**А) генерал Д.Р. Паўлаў**

Б) генерал-маёр У.Я. Клімаўскіх

В) камісар А.Я. Фаміных

На аснове матэрыялаў: Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны) : дапаможнік для ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А.А. Каваленя [і інш] ; пад рэд. А.А. Кавалені. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2020 (§ 3, стар. 43).

8. Бостанская бойня адбылася раней за Бостанскае чаяванне на:

А) 2 гады

**Б) 3 гады**

В) 4 гады

Г) 5 гадоў

На аснове матэрыялаў: Сусветная гісторыя Новага часу, XVI–XVIII стст. : вучэб. дапаможнік для 7-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання / У.С. Кошалеў [і інш] ; пад рэд. У.С. Кошалева. – 2-е выд., перагледж. і дап. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2024 (§ 19, стар. 126).

9. Закон аб стварэнні асобнага ад Польшчы найвышэйшага апеляцыйнага суда быў падпісаны:

А) Генрыхам Валуа

Б) Жыгімонтам ІІ Аўгустам

В) Жыгімонтам І Старым

**Г) Стафанам Баторыем**

На аснове матэрыялаў: Гісторыя Беларусі, XVI–XVIII стст. : вучэб. дапаможнік для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / В.А. Варонін [і інш] ; пад рэд. В.А. Вароніна, А.А. Скеп’ян. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2017 (§ 9, стар. 63).

10. Сярэднюю адукацыю ў Беларусі першай паловы XIX ст. давалі:

А) семінарыі

**Б) гімназіі**

В) прыходскія школы

Г) ланкастарскія школы

На аснове матэрыялаў: Паноў, С.В. Гісторыя Беларусі, канец XVIII – пачатак XX ст. : вучэб. дапаможнік для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / С.В. Паноў, С.В. Марозава, У.А. Сосна ; пад рэд. У.А. Сосны. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2018 (§ 9, стар. 39).

11. «Лепельскі контрудар» пачаўся:

А) 3 ліпеня 1941 г.

Б) 23 ліпеня 1941 г.

**В) 6 ліпеня 1941 г.**

Г) 29 чэрвеня 1941 г.

На аснове матэрыялаў: Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны) : дапаможнік для ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А.А. Каваленя [і інш] ; пад рэд. А.А. Кавалені. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2020 (§ 5, стар. 67).

12. Гады праўлення прэм’ер-міністра Вялікабрытаніі Маргарэт Тэтчэр:
А) 1975–1990 гг.
**Б) 1979–1990 гг.**
В) 1981–1990 гг.
Г) 1979–1991 гг.

На аснове матэрыялаў: Сусветная гісторыя Навейшага часу, 1918 – пачатак XXI ст.: вучэб. дапаможнік для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / У.С. Кошалеў, М.А. Краснова, Н.У. Кошалева ; пад рэд. У.С. Кошалева. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2019 (§ 27, стар. 142).

13. «Ісламская рэвалюцыя» – антыманархічная рэвалюцыя ў Іране выбухнула ў:
А) 1979 г.
Б) 1977 г.
В) 1980 г.
**Г) 1978 г.**

На аснове матэрыялаў: Сусветная гісторыя Навейшага часу, 1918 – пачатак XXI ст.: вучэб. дапаможнік для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / У.С. Кошалеў, М.А. Краснова, Н.У. Кошалева ; пад рэд. У.С. Кошалева. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2019 (§ 44, стар. 230).

14. Укажыце дату пачатку аперацыі «Оверлорд»:
**А) 6 чэрвеня 1944 г.**
Б) 6 ліпеня 1944 г.
В) 6 жніўня 1944 г.
Г) 7 ліпеня 1944 г.

На аснове матэрыялаў: Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны) : дапаможнік для ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А.А. Каваленя [і інш] ; пад рэд. А.А. Кавалені. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2020 (§ 14, стар. 182–183).

15. Першая беларуская жанчына-касманаўт, Герой Беларусі:
А) А. Кандакова
**Б) М. Васілеўская**
В) В. Царашкова
Г) С. Савіцкая

На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А.Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі: вучэб. дапаможнік для 11-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 2 / А.Г. Каханоўскі [і інш]; пад рэд. А.Г. Каханоўскага. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2025 (§ 49, стар. 281).

16. Рэспубліка Беларусь афіцыйна стала краінай – партнёрам БРІКС у:
А) кастрычніку 2024 г.
Б) лістападзе 2022 г.
В) снежні 2020 г.
**Г) лістападзе 2024 г.**

На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А.Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі: вучэб. дапаможнік для 11-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 2 / А.Г. Каханоўскі [і інш]; пад рэд. А.Г. Каханоўскага. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2025 (§ 48, стар. 273).

17. Умовы для рэалізацыі «амерыканскага» шляху развіцця капіталізму ў Расіі былі створаны ў выніку правядзення:
А) інвентарнай рэформы
Б) рэформы П. Кісялёва
**В) сталыпінскай рэформы**
Г) сялянскай рэформы 1861 г.

На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А.Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі: вучэб. дапаможнік для 11-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы агуль. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 1 / А.Г. Каханоўскі [і інш]; пад рэд. А.Г. Каханоўскага. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2025 (§ 7, стар. 90–91).

18. Першым епіскапам Тураўскай епархіі быў:
**А) Фама**
Б) Міна
В) Кірыл
Г) Глеб

На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А.Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі: вучэб. дапаможнік для 10-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы агуль. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 1 / А.Г. Каханоўскі [і інш]; пад рэд. А.Г. Каханоўскага. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2024 (§ 18, стар. 192).

19. Перыяд жалезнага веку на тэрыторыі Беларусі:
А) 2-е тысячагоддзе да н. э. – канец VIII ст. да н. э.
Б) 9–5-е тысячагоддзе да н. э.
**В) VII ст. да н. э. – канец V ст. н. э.**
Г) V ст. да н. э. – канец VIII ст. н. э.

На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А.Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі: вучэб. дапаможнік для 10-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 1 / А.Г. Каханоўскі [і інш]; пад рэд. А.Г. Каханоўскага. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2024 (стар. 220).

20. Колькі, згодна з данымі Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь, было створана нацысцкіх лагераў смерці на акупаванай тэрыторыі БССР?

А) больш за 360

Б) больш за 180

В) больш за 460

**<u>Г) больш за 580</u>**

На аснове матэрыялаў: Геноцид белорусского народа в годы Великой Отечественной войны 10–11 классы. Учебное пособие для учащихся учреждений образования, реализующих образовательные программы общего среднего образования с белорусским и русским языками обучения и воспитания. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2023. – С. 7.

Паважаныя члены журы!

У заданнях 21–25 патрабавалася правільна суаднесці звесткі з левай і правай калонак табліцы. Правільныя адказы пазначаны тлустым падкрэсліваннем.

**За правільна выкананае заданне – да 4 балаў.**

**21. Суаднясіце дату і падзею, якія мелі месца ў войнах ВКЛ з Маскоўскім княствам у першай палове XVI ст.:**

| | |
|---|---|
| А) Вайна 1500–1503 гг. | 1) Бітва пад Оршай |
| Б) Вайна 1507–1508 гг. | 2) ВКЛ вярнула Гомель з прылягаючай да яго тэрыторыяй |
| В) Вайна 1512–1522 гг. | 3) Бітва на рацэ Вядрошы |
| Г) Вайна 1534–1537 гг. | 4) Супала з мяцяжом Міхаіла Глінскага |

**<u>А3 Б4 В1 Г2</u>**

На аснове матэрыялаў: Гісторыя Беларусі, XVI–XVIII стст. : вучэб. дапаможнік для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / В.А. Варонін [і інш] ; пад рэд. В.А. Вароніна, А.А. Скеп'ян. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2017 (§ 2, стар. 15–17).

**22. Суаднясіце мараплавальнікаў, канкістадораў з іх адкрыццём, заваёвай:**

| | |
|---|---|
| А) Хрыстафор Калумб | 1) Дзякуючы яго падарожжу ў Вест-Індыю атрымала новую назву «Амерыка» |
| Б) Амерыга Веспучы | 2) Заваяваў імперыю інкаў у Перу |
| В) Эрнан Картэс | 3) Адкрыў новы кантынент, названы ім «Вест-Індыяй», але так і не даведаўся аб гэтым |
| Г) Франсіска Пісара | 4) Заваяваў дзяржаву ацтэкаў |

**<u>А3 Б1 В4 Г2</u>**

На аснове матэрыялаў: Сусветная гісторыя Новага часу, XVI–XVIII стст. : вучэб. дапаможнік для 7-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання / У.С. Кошалеў [і інш] ; пад рэд. У.С. Кошалева. – 2-е выд., перагледж. і дап. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2024 (§ 2, стар. 12–17).

**23. Суаднясіце назву карнай аперацыі нацысцкіх захопнікаў з тэрыторыяй, на якой яна праведзена:**

| | |
|---|---|
| А) «Балотная ліхаманка» | 1) Брэсцкая, Віцебская, Мінская вобласці |
| Б) «Шаравая маланка» | 2) Жыткавіцкі, Петрыкаўскі, Любанскі, Старобінскі, Капаткевіцкі раёны |
| В) «Русалка» | 3) Васілевіцкі, Калінкавіцкі, Хойніцкі раёны |
| Г) «Асвячэнне храма» | 4) Суражская партызанская зона |

**<u>А1 Б4 В2 Г3</u>**

На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А.Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі: вучэб. дапаможнік для 11-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 2 / А.Г. Каханоўскі [і інш]; пад рэд. А.Г. Каханоўскага. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2025 (§ 30, стар. 47).

**24. Суаднясіце назву мемарыялаў з іх выявай:**

| | |
|---|---|
| А) Мемарыял «Чырвоны Бераг» | 1)  |
| Б) Мемарыяльны комплекс «Хатынь» | 2)  |

| | |
|---|---|
| В) Манумент у гонар Маці-патрыёткі Н.Ф. Купрыянавай | 3)  |
| Г) Мемарыяльны комплекс «Прарыў» | 4)  |

**<u>А3 Б4 В1 Г2</u>**

На аснове матэрыялаў: Паноў, С.В. Гісторыя Беларусі, 1917 г. – пачатак XXI ст. : вучэб. дапаможнік для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / С.В. Паноў, У.Н. Сідарцоў, В.М. Фамін. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2019 (§ 3–16, стар. 74, 78, 88).

**25. Суаднясіце лозунгі, пад якімі праходзілі Усебеларускія народныя сходы, і даты правядзення:**

| | |
|---|---|
| А) «Разам – за моцную квітнеючую Беларусь!» | 1) 2010 г. |
| Б) «Час выбраў нас!» | 2) 2016 г. |
| В) «Наш гістарычны выбар – незалежная, моцная і квітнеючая Беларусь» | 3) люты 2021 г. |
| Г) «Адзінства! Развіццё! Незалежнасць!» | 4) красавік 2024 г. |

**<u>А2 Б4 В1 Г3</u>**

На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А.Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі: вучэб. дапаможнік для 11-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 2 / А.Г. Каханоўскі [і інш]; пад рэд. А.Г. Каханоўскага. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2025 (§ 43–44, стар. 229–231).

Паважаныя члены журы!
У заданнях 26–30 трэба было вызначыць і запісаць правільную паслядоўнасць падзей.
**За кожнае правільна выкананае заданне – 4 балы.**

**26. Расстаўце ў храналагічнай паслядоўнасці падзеі з гісторыі Старажытнага свету:**

А) Пачатак Траянскай вайны
Б) Узяцце і разгром Рыма готамі
В) Першая Алімпіяда
Г) Прыняцце Законаў XII табліц

**АВГБ**

На аснове матэрыялаў: Гісторыя Старажытнага свету (у 2 частках, частка 2): вучэб. дапаможнік для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / У.С. Кошалеў, А.А. Прохараў, А.В. Перзашкевіч, В.Г. Жураўлевіч ; пад рэд. У.С. Кошалева. – Мінск : Народная асвета, 2019 (§ 3, стар. 12, § 14, стар. 59, § 18, стар. 79, § 29, стар. 122).

**27. Расстаўце ў храналагічнай паслядоўнасці падзеі Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі:**

А) Баранавіцкая аперацыя
Б) Нарачанская аперацыя
В) Абарона Смаргоні
Г) Свянцянскі прарыў

**ГВБА**

На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А.Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі: вучэб. дапаможнік для 11-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 1 / А.Г. Каханоўскі [і інш]; пад рэд. А.Г. Каханоўскага. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2025 (§ 16, стар. 172–177, 310).

**28. Расстаўце падзеі Другой сусветнай вайны ў храналагічнай паслядоўнасці:**

А) Пачатак блакады Ленінграда
Б) Напад японскіх узброеных сіл на Пёрл-Харбар
В) Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён»
Г) Тэгеранская канферэнцыя

**АБГВ**

На аснове матэрыялаў: Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны) : дапаможнік для ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А.А. Каваленя [і інш] ; пад рэд. А.А. Кавалені. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2020 (стар. 225–228).

**29. Расстаўце ў храналагічнай паслядоўнасці падзеі:**

А) Будаўніцтва Сафійскага сабора ў Полацку
Б) Заснаванне хрысціянскай епархіі ў Полацку
В) Княжанне Брачыслава Ізяславіча
Г) Княжанне ў Менску Глеба Усяславіча

**БВАГ**

На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А.Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі: вучэб. дапаможнік для 10-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 1 / А.Г. Каханоўскі [і інш]; пад рэд. А.Г. Каханоўскага. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2024 (стар. 220–221).

**30. Расстаўце ў храналагічнай паслядоўнасці падзеі:**

А) Стварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў
Б) Прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце РСФСР
В) Выбранне Генеральным сакратаром КПСС М.С. Гарбачова
Г) І З'езд народных дэпутатаў СССР

**ВГБА**

На аснове матэрыялаў: Сусветная гісторыя Навейшага часу, 1918 – пачатак XXI ст.: вучэб. дапаможнік для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / У.С. Кошалеў, М.А. Краснова, Н.У. Кошалева ; пад рэд. У.С. Кошалева. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2019 (§ 36–37, стар. 187–196).

Паважаныя члены журы!
У заданнях 31–35 патрабавалася вызначыць правільныя сцверджанні.
Правільны адказ пазначаны тлустым падкрэсліваннем.
**За правільны адказ – 2 балы.**

**31.**

1) У 964 г. балгары першымі сярод славян прынялі хрысціянства з Візантыі.

2) У VIII ст. утварыўся Арабскі халіфат.

А) Правільнае толькі 1
Б) Правільнае толькі 2
В) Абодва сцверджанні правільныя
**Г) Абодва сцверджанні няправільныя**

На аснове матэрыялаў: Гісторыя Сярэдніх вякоў : вучэб. дапаможнік для 6-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання і выхавання / А.А. Прохараў [і інш] ; пад рэд. А.А. Прохарава. – Мінск : Народная асвета, 2023 (§ 16, стар. 103, § 24, стар. 157).

**32.**

1) 1860–1880-я гг. – правядзенне буржуазных рэформаў Мэйдзі ў Японіі.

2) 1860–1880-я гг. – правядзенне буржуазных рэформаў на тэрыторыі Беларусі.

А) Правільнае толькі 1

Б) Правільнае толькі 2

**В) Абодва сцверджанні правільныя**

Г) Абодва сцверджанні няправільныя

На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А.Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі: вучэб. дапаможнік для 11-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 1 / А.Г. Каханоўскі [і інш]; пад рэд. А.Г. Каханоўскага. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2025 (§ 4, стар. 61).

**33.**

1) Альмекі з'явіліся на ўзбярэжжы Мексіканскага заліва ў трэцім тысячагоддзі да н. э.

2) Каля 20 тысяч гадоў таму адбылося адступленне ледавіка.

**А) Правільнае толькі 1**

Б) Правільнае толькі 2

В) Абодва сцверджанні правільныя

Г) Абодва сцверджанні няправільныя

На аснове матэрыялаў: Гісторыя Старажытнага свету (у 2 частках, частка 1) : вучэб. дапаможнік для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / У.С. Кошалеў, А.А. Прохараў, А.В. Перзашкевіч, В.Г. Жураўлевіч; пад рэд. У.С. Кошалева. – Мінск : Народная асвета, 2019 (§ 29, стар. 124, § 6, стар. 24).

**34.**

1) Мінск атрымаў магдэбургскае права ў 1501 г.

2) У 1773 г. – стварэнне ў Рэчы Паспалітай першага ў Еўропе міністэрства асветы – Адукацыйнай камісіі.

А) Правільнае толькі 1

**Б) Правільнае толькі 2**

В) Абодва сцверджанні правільныя

Г) Абодва сцверджанні няправільныя

На аснове матэрыялаў: Гісторыя Беларусі, XVI–XVIII стст. : вучэб. дапаможнік для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / В.А. Варонін [і інш] ; пад рэд. В.А. Вароніна, А.А. Скеп'ян. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2017 (§ 29, стар. 192, § 3, стар. 22).

**35.**
1) 11 верасня 1931 г. была абвешчана Кітайская Савецкая Рэспубліка.
2) 23 кастрычніка 1923 г. Турцыя была абвешчана рэспублікай.

А) Правільнае толькі 1
Б) Правільнае толькі 2
**В) Абодва сцверджанні правільныя**
Г) Абодва сцверджанні няправільныя

На аснове матэрыялаў: Сусветная гісторыя Навейшага часу, 1918 – пачатак XXI ст.: вучэб. дапаможнік для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / У.С. Кошалеў, М.А. Краснова, Н.У. Кошалева ; пад рэд. У.С. Кошалева. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2019 (§ 15, стар. 79, § 18, стар. 91).

Паважаныя члены журы!
У заданнях 36–40 патрабавалася вызначыць па апісанні жыцця і дзейнасці гістарычную асобу. Правільны адказ пазначаны тлустым падкрэсліваннем.
**За правільны адказ – 2 балы.**

**36.** Ён быў адным з першых, хто прапанаваў ідэю пабудаваць высокамаральнае і гарманічнае грамадства. А залатое правіла яго этыкі гучала так: «Не рабі іншаму таго, чаго не жадаеш сабе».
**Канфуцый**

На аснове матэрыялаў: Гісторыя Старажытнага свету (у 2 частках, частка 1): вучэб. дапаможнік для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / У.С. Кошалеў, А.А. Прохараў, А.В. Перзашкевіч, В.Г. Жураўлевіч; пад рэд. У.С. Кошалева. – Мінск : Народная асвета, 2019 (§ 27, стар. 117–118).

**37.** Рускі асветнік, вучоны-энцыклапедыст, паэт і мысляр. У 1731 г. паступіў у Маскоўскую славяна-грэка-лацінскую акадэмію. З 1735 г. вучыўся ва ўніверсітэце Санкт-Пецярбурга, у 1736–1741 гг. – у Германіі. У 1748 г. заснаваў пры расійскай Акадэміі навук першую хімічную лабараторыю. У 1755 г. па яго праекце быў заснаваны Маскоўскі ўніверсітэт. Узбагаціў шматлікія галіны ведаў. Заклаў асновы рускай літаратурнай мовы. Сфармуляваў прынцып захавання матэрыі і руху. Адкрыў атмасферу на Венеры.

**Міхаіл Ламаносаў**

На аснове матэрыялаў: Сусветная гісторыя Новага часу, XVI–XVIII стст. : вучэб. дапаможнік для 7-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання / У.С. Кошалеў [і інш] ; пад рэд. У.С. Кошалева. – 2-е выд., перагледж. і дап. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2024 (§ 26, стар. 80).

**38.** Ён адзін з першых пачаў ствараць карціны на касмічную тэму; пры гэтым нават на чужых планетах ён адлюстроўваў пейзажы роднай беларускай прыроды. Доўгі час пра яго жыццё і дзейнасць не было вядома. Яго імя стала яркім адкрыццём у Беларусі ў 1984 г. дзякуючы выхаду ў свет кнігі «Вечны вандроўнік» вядомага пісьменніка і вучонага А.С. Ліса.

**Язэп Драздовіч**

На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А.Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі: вучэб. дапаможнік для 11-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 1 / А.Г. Каханоўскі [і інш]; пад рэд. А.Г. Каханоўскага. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2025 (§ 24, стар. 286).

**39.** Вялікі князь усё жыццё правёў у ваенных паходах поплеч са сваёй дружынай, далучыўшы да ВКЛ немалыя землі. Нават здабыўшы славу сапраўднага военачальніка і доблеснага палкаводца, калі быў старым, ён працягваў асабіста кіраваць войскам падчас ваенных паходаў. Менавіта па яго загадзе было пачата будаўніцтва каменных замкаў па лініі Трокі – Вільня – Меднікі – Гародня – Навагародак – Ліда – Крэва – Мядзел.

**Гедымін**

На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А.Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі: вучэб. дапаможнік для 10-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 2 / А.Г. Каханоўскі [і інш]; пад рэд. А.Г. Каханоўскага. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2024 (§ 23–24, стар. 37).

**40.** Герой Савецкага Саюза. Генерал-лейтэнант інжынерных войск. Летам 1941 г. пры спробе выйсці з акружэння быў цяжка кантужаны ў баі каля ракі Дняпро паблізу в. Дабрэйка Магілёўскай вобласці. Адмовіўся супрацоўнічаць з немцамі. Калі быў вязнем канцэнтрацыйных лагераў (прайшоў праз 11 лагераў), праводзіў сярод ваеннапалонных актыўную антыфашысцкую работу. Пакараны смерцю ў канцлагеры Маўтхаўзен 18 лютага 1945 г.

**Дзмітрый Карбышаў**

На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А.Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі: вучэб. дапаможнік для 11-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 2 / А.Г. Каханоўскі [і інш]; пад рэд. А.Г. Каханоўскага. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2025 (§ 30, стар. 44).

Паважаныя члены журы!
У заданнях 41–46 неабходна пазнаць гістарычную асобу па выяве. Адказы ўпісаны пад выявай.
**За правільны адказ – да 3 балаў.**

| | | |
|---|---|---|
|  |  |  |
| **41. Ваўпшасаў Станіслаў Аляксеевіч** С. 282 | **42. Чан Кайшы** С. 233 | **43. Генры Форд** С. 225 |
|  |  |  |
| **44. Рагазінскі Мікалай Уладзіміравіч** С. 216 | **45. Якуб Колас (Канстанцін Міцкевіч)** С. 147 | **46. Адам Чартарыйскі** С. 120 |

На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А.Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі: вучэб. дапаможнік для 11-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 1 / А.Г. Каханоўскі [і інш]; пад рэд. А.Г. Каханоўскага. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2025.

Паважаныя члены журы!
У заданнях 47–56 неабходна было вызначыць прыведзеныя ніжэй паняцці.
**За кожны адказ – 2 балы.**

| | |
|---|---|
| **47. Манаполія** С. 57 | выключнае права дзяржавы, саслоўя або арганізацыі на гандаль ці якую-небудзь іншую сферу дзейнасці |
| **48. Нацыя** С. 135 | устойлівая супольнасць людзей, якая гістарычна склалася на аснове агульнасці мовы, тэрыторыі, |

| | |
|---|---|
| | эканамічнага жыцця, нацыянальнага характару, самасвядомасці і культуры |
| **49. Беларусазнаўства**<br>С. 137 | гуманітарная дысцыпліна, аб’ектам вывучэння якой з’яўляецца Беларусь, яе гісторыя, традыцыі, культура, сацыяльнае жыццё і г. д. |
| **50. Хутар**<br>С. 90 | адасоблены ўчастак зямлі, на які пераносілася сядзіба селяніна, а таксама сельскагаспадарчы інвентар, неабходны для апрацоўкі зямлі |
| **51. Мілітарызм**<br>С. 202 | ідэалогія і палітыка актыўнага нарошчвання і выкарыстання ваеннай магутнасці дзяржавы; дамінаванне ваенных у дзяржаўным і грамадскім жыцці |
| **52. Манапалістычны капіталізм (імперыялізм)**<br>С. 57 | стадыя капіталізму, галоўнымі асаблівасцямі якой з’яўляюцца панаванне манаполій і абвастрэнне барацьбы паміж дзяржавамі за сферы ўплыву ў свеце |
| **53. Беларусізацыя**<br>С. 274 | палітыка нацыянальна-культурнага і нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў БССР у 1920-я гг. |
| **54. Шавінізм**<br>С. 23 | крайняя форма нацыяналізму, якая можа выражацца ў падаўленні іншых народаў у рамках шматнацыянальных дзяржаў. Можа выступаць асновай для нацыяналістычных і экстрэмісцкіх настрояў |
| **55. Нацыяналізм**<br>С. 23 | ідэалогія і кірунак палітыкі, асноватворным прынцыпам якой з’яўляецца тэзіс аб каштоўнасці нацыі як вышэйшай формы грамадскага адзінства, яе першаснасці ў працэсе ўтварэння дзяржавы |
| **56. Індустрыяльнае грамадства**<br>С. 18 | грамадства, якое сфарміравалася ў выніку развіцця навукі, тэхнікі, прамысловага перавароту |

На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А.Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі: вучэб. дапаможнік для 11-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 1 / А.Г. Каханоўскі [і інш]; пад рэд. А.Г. Каханоўскага. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2025.

Паважаныя члены журы!
У заданнях 57–60 неабходна было вызначыць, якому гораду належыць герб. Правільныя адказы запісаны пад выявамі.
**За кожны правільны адказ – 3 балы.**

| | | | |
|---|---|---|---|
|  |  |  |  |
| **57. Слуцк** | **58. Полацк** | **59. Мінск** | **60. Гродна** |

На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А.Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі: вучэб. дапаможнік для 10-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 2 / А.Г. Каханоўскі [і інш]; пад рэд. А.Г. Каханоўскага. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2024 (§ 27, стар. 71).